## № 89. Алесі Бабарэцы

*9 лютага 1935 г.*

Дзень добры, Лялюсік!

Вітаю цябе з днём твайго нараджэньня і жадаю табе ў добрым здароўі вялікай і разумнай расьці на радасьць і ўцеху сваім бацьком і сабе на шчасьце.

Прыехаць, Лялюсік, к твайму дню не магу, няма як кінуць работы. Прыяжджай калі–небудзь ты з Лорачкай да мяне. Я буду вельмі рад.

Напішы, Лялюсік, як твой дзень у Вас пройдзе, хто ў госьці да цябе прыдзе, і якія ты з Лорачкаю будзеш рабіць выступленьні.

Прывітаньне табе ад дзядзі Антося.

Цалую цябе моцненька.

Твой *бацік*.

## № 90. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*[Люты 1935]*

Любыя Анечка, Лорачка, Лялячка!

Так сьпяшаўся, што напісаў ліст, каб перадаць праз Любоў Нікалаеўну, ды забыўся на кватэры ўзяць яго з сабою. І вось пішу ўжо на станцыі гэтую лістоўку. Купіў я мультану на сукенкі Лорачцы і Лялячцы 6 мэтраў, магчыма, і за многа на сукенкі, дык можа яшчэ табе Анечка блюзка выйдзе. Хоць на блюзку дык, мусіць, яно не хопіць. Лепш, калі што астанецца, скарыстаць на рэйтузы дзецям.

Была яшчэ фланэль цёмна–мышастага колеру. Ды не адважыўся я браць без цябе. А можа на рэйтузы і добра было–б. Ты, Анечка, напішы, дык калі будзе, яшчэ я вазьму.

Давалі нам рыбу — судака пасылаю Вам. Даўно ўжо не было ў нас рыбы. Вымачыўшы яе добра, можна засмажыць — і будзе добра. Адным словам, што–небудзь прыдумаеш з яе.

Ужо назначан глаўбух, але ня прыехаў. Магчыма, прыедзе пасьля выхаднога. Наконт мае працы на далей яшчэ гутаркі ня... *[тэкст абрываецца]*

## № 91. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*20.II.1935*

Любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Учора атрымаў вашу лістоўку і чакаю падрабязнага ліста.

Я гэтымі часамі зноў пачаў вечарамі займацца. Не падабаецца мне гэтая работа вечарамі. Але, магчыма, хутка скончым. Усё яшчэ цягнецца тая–ж неўпарадкаванасьць у штаце і рабоце. Глаўбух гандлёвага аддзелу ёсьць ужо, так што хутка павінна ўсё гэта ўпарадкавацца.

Ад Язэпа я атрымаў лістоўку. Чакае карткі. Аня, там ёсьць канвэрт з напісаным адрасам яго, вазьмі ўлажы ў яго картку да напішы да яе пару слоў і пашлі. А то, сапраўды, нядобра выходзіць, абяцаць абяцалі, а паслаць не паслалі. Няхай Лорачка